ПАД МІРНЫМ НЕБАМ БЕЛАРУСІ

# 8 ДЗЯСЯТКАЎ ГАДОЎ БЕЗ ВАЙНЫ



**8 мая, напярэдадні свята 80-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў Дзяржаўнай установе адукацыі «Сярэдняя школа № 40 імя В. І. Крэмко г. Гродна» адбылася чарговая грамадска-літаратурная акцыя Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ «Пад мірным небам Беларусі». Як і папярэднія мерапрыемствы з гэтага цыкла, майскую сустрэчу са школьнікамі літаратары прысвяцілі юбілею Перамогі.**

**ДЛЯ ДАВЕДКІ.** Грамадска-літаратурная акцыя «Пад мірным небам Беларусі» была ініцыяваная Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі ў 2015 годзе. Яна праходзіць з удзелам пісьменнікаў у форме творчых сустрэч, вечароў паэзіі, публічных літаратурных мерапрыемстваў ваенна-патрыятычнай і грамадзянскай тэматыкі ва ўстановах адукацыі і культуры г. Гродна і Гродзенскай вобласці. Мэты акцыі – з дапамогай мастацкага слова аддаць даніну памяці і пашаны ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, савецкаму народу-пераможцу фашызму, выказаць удзячнасць за магчымасць сёння жыць пад мірным небам; прыцягнуць увагу прадстаўнікоў розных пакаленняў да недапушчальнасці паўтарэння жахаў вайны.



Па запрашэнні настаўніка гісторыі, пісьменніка-краязнаўца, аўтара некалькіх кніг пра Гродна Дзяніса Паўлавіча Тарасюка ў госці да вучняў 9 «Я» класа СШ № 40 завіталі гродзенскія паэтэсы Кацярына Каламійцава, Вольга Алізар, а таксама паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. Ужо не першае сёлета тэматычнае выступленне творцаў у гэтай школе па сутнасці стала літаратурным урокам мужнасці і памяці.

Мастацкае слова. Яно ўжо не аднойчы пацвярджала сваю здольнасць пераконваць, выхоўваць і адукоўваць. З яго дапамогай можна данесці самую няпростую інфармацыю, раскрыць самую важную тэму. Так і адбылося гэтым разам. Самай важнай задачай для ўсіх беларусаў на сённяшні дзень з’яўляецца захаванне гістарычнай памяці. Менавіта памяць аб тых страшных гадах самай жорсткай у гісторыі чалавецтва вайны, гадах кровапраліцця і шматлікіх ахвяр аб’ядноўвае сёння сапраўдных беларусаў, нашчадкаў пераможцаў фашызму. Беларусь страціла кожнага трэцяга. Вайна закранула кожную беларускую сям’ю. Таму разам з матывам памяці вельмі істотнымі з’яўляюцца, біяграфічныя, сямейныя матывы ў творах айчынных творцаў на дадзеную тэматыку.



У пачатку сустрэчы старшакласнікі па традыцыі даведаліся пра літаратурнае жыццё Прынёмання, пра дзейнасць Саюза пісьменнікаў Беларусі і яго Гродзенскага абласнога аддзялення, атрымалі запрашэнне да супрацоўніцтва з пісьменніцкай арганізацыяй вобласці. У няпросты цяперашні час дарослыя і моладзь, пісьменнікі і грамадства – адзіныя. Сёння ў нас агульныя задачы – супрацьстаяць пагрозам, бараніць нашу гісторыю ад фальсіфікацый, шанаваць подзвіг савецкага народа-пераможца. Тым больш, калі ў назве творчай грамадскай арганізацыі на першым месцы стаіць слова «Саюз», сугучнае назве нашай Савецкай Радзімы. Таму разам з сакральнымі матывамі памяці і патрыятызму надзвычайную важнасць набывае для беларускага шматнацыянальнага грамадства матыў адзінства. Пра гэта ва ўступным слове сказаў член СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык.



8 дзясяткаў гадоў Беларусь не ведае вайны… Кожны з літаратараў звярнуўся да моладзі з заклікам усведамляць гэта, даражыць мірным жыццём, захоўваць вернасць ідэалам, якія на палях Вялікай Айчыннай вайны бясстрашна здабывалі нашы дзяды і прадзеды. …Член Саюза пісьменнікаў Беларусі Кацярына Каламійцава прачытала вершы, прысвечаныя вобразу маці, сацыяльнай катэгорыі «дзеці вайны», падзялілася некаторымі фактамі з сямейнага летапісу. Кожны радок паэтэсы, удзельніцы грамадска-літаратурнай акцыі СПБ-Гродна «Пад мірным небам Беларусі» прагучаў трывожным набатам і гімнам чалавечай мужнасці. …Пераможца шматлікіх літаратурных конкурсаў, паэтэса Вольга Алізар распавяла пра тое, як вайна балюча пагаспадарыла ў гісторыі яе сям’і, прысвяціла сваё выступленне вобразам яе дзядоў, а таксама ўсенароднаму святу Перамогі, якое, на жаль, для многіх з нас з’яўляецца святам са слязамі на вачах. У выкананні паэтэсы Вольгі Алізар прагучалі аўтарскія вершы на беларускай мове. …Нарыс пра дзеда-франтавіка, які мінамётчыкам прайшоў усю вайну ад Масквы да Берліна, узнагароджаны баявымі медалямі, у

2023 годзе прынёс Дзмітрыю Радзівончыку перамогу ў расійска-беларускім літаратурным конкурсе імя К. Сіманава, у намінацыі «Публіцыстыка». Гэты твор, нарыс «Один из тысяч» у памяць пра яго героя, у гонар усіх ветэранаў Вялікай Айчыннай агучваецца аўтарам на розных пляцоўках ужо на працягу двух гадоў, апублікаваны ў калектыўных зборніках у Беларусі і Расіі.

Падчас мерапрыемства ў школьным класе стаяла поўная, ідэальная цішыня… Выступленне гасцей было ўспрынята аўдыторыяй са шчырай зацікаўленасцю, пасля кожнага твора гучалі апладысменты. Таксама па добрай традыцыі скончылася літаратурная сустрэча дарэннем аўтарскай кнігі і сумесным фатаграфаваннем. Мерапрыемствы ў межах прымеркаванай да 80-годдзя Перамогі грамадска-літаратурнай акцыі Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ «Пад мірным небам Беларусі» працягваюцца. З Днём Перамогі, сябры!

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** грамадска-літаратурная акцыя «Пад мірным небам Беларусі» і яе ўдзельнікі. Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 40 імя В. І. Крэмко г. Гродна», 8 мая 2025 года.



Кацярына Каламійцава



Вольга Алізар

ПАД МІРНЫМ НЕБАМ
БЕЛАРУСІ



ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

БЕЛАРУСІ





ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

БЕЛАРУСІ





ПАД МІРНЫМ НЕБАМ
БЕЛАРУСІ

средняя
школа
№40
имени
В.И. Кремко
г.Гродно

www.pisateli.by